**1 верасня 2023 г. – 50 гадоў з часу адкрыцця дзяржаўнай установы адукцыя «Сярэдняя школа № 6 г. Кобрына» (1973)**




19 чэрвеня 1973 года Кобрынскім гарадскім Саветам дэпутатаў працоўных было прынята рашэнне аб адкрыцці сярэдняй школы № 6 у горадзе Кобрыне. Урачыстае адкрыццё школы ў новым чатырохпавярховым будынку па вул. Леніна, 71 адбылося 1 верасня 1973 года.

Першым дырэктарам школы стаў Аляксандр Маліноўскі, які сфарміраваў педагагічны калектыў. У школе была створана камсамольская арганізацыя, а піянерская дружына пачала змагацца за прысваенне ёй імя А. П. Гайдара, любімага дзіцячага пісьменніка. У чэрвені 1975 года адбыўся першы выпуск, а ўжо ў 1976 годзе школай быў выпушчаны першы залаты медаліст.

Ва ўстанове прадугледжвалася выкладанне шэрагу прадметаў на англійскай мове. Высокі ўзровень выкладання англійскай мовы адразу стаў асаблівасцю шостай школы. Сюды з усяго горада пацягнуліся па веды вучні, якія імкнуцца звязаць сваё жыццё з замежнымі мовамі. У рамках праграмы ўрада ЗША «Акт у падтрымку свабоды» вучань школы Андрэй Панасюк на працягу года навучаўся ў ЗША.

За час свайго існавання ў школе ствaралася і ўдасканальвалася вучэбна-матэрыяльная база, кабінеты абсталёўваліся неабходнымі наглядньімі дапаможнікамі, дыдактычнымі матэрыяламі, добраўпарадкоўваўся школьны двор, спартовая пляцоўка. Вялікі аб'ём работы па добраўпарадкаванні школы быў зроблены ў 2009 годзе ў рамках правядзення рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі». Тады былі заменены вокны, будынак набыў сучасны выгляд. У апошнія гады з дзяржаўнай падтрымкай былі абсталяваны два камп'ютарныя класы, новыя кабінеты фізікі і хіміі.

За дасягнутыя поспехі ў рабоце з падрастаючым пакаленнем школа неаднаразова ўзнагароджвалася граматамі Міністэрства адукацыі. У 1996-1997 навучальным годзе СШ №

6 заняла II месца па выніках гарадскога конкурсу на лепшую школу.

Цяпер у школе навучаюцца 1067 дзяцей. Вучні годна адстойваюць гонар школы на алімпіядах па вучэбных прадметах, навукова-практычных канферэнцыях, розных конкурсах. У 2022–2023 навучальным годзе на раённым этапе навучэнцы школы атрымалі сем дыпломаў, у тым ліку па хіміі, біялогіі, фізіцы, матэматыцы, беларускай мове, два пахвальныя водгукі па хіміі і англійскай мове. З 36 выпускнікоў 2022–2023 навучальнага года 83% паступілі ў ВНУ і ССНУ. Навучэнец СШ № 6 г. Кобрына Юрый Філіпаў - лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

На высокім узроўні ў школе пастаўлена навукова-даследчая дзейнасць. Настаўнікі матэматыкі - бацька і сын - Якаў і Віктар Лагвіновічы са сваімі вучнямі не раз станавіліся пераможцамі конкурсаў даследчага характару на абласным і рэспубліканскім узроўнях. Створаны па іх ініцыятыве ў 2019 годзе навігацыйна-турыстычны інтэрнэт-партал «Пазнай Кобрын» з'яўляецца самым маштабным праектам Рэспублікі Беларусь аб асобным рэгіёне.

Школа актыўна падтрымлівае праектную дзейнасць, у тым ліку экалагічнага напрамку. Так, у 2012 годзе ўстанова далучылася да ініцыятывы «Сетка зялёных школ у Беларусі», а ўжо ў 2013 годзе атрымала статус «Зялёная школа». У 2021 годзе школа ў чарговы раз пацвердзіла свой «зялёны» статус дыпломам II ступені.

Насычанае жыццё ў членаў піянерскай і камсамольскай арганізацый школы. Піянеры (дружына «Брыганціна» імя Нюры Кіжаватавай) на чале з педагогамі-арганізатарамі актыўна падтрымліваюць усе ініцыятывы, некалькі гадоў запар займаюць лідзіруючыя пазіцыі ў раёне сярод піянерскіх арганізацый. У 2022 годзе «брсэмаўцы» стварылі лепшы TikTok «Валанцёр года», лепшым валанцёрскім атрадам прызнаны валанцёрскі атрад школы «БлагоДарю».

Леанід Мікалаевіч Адачук (1978–1984), Віталій Панцялеевіч Майсяюк (1984–2000), Любоў Васільеўна Тур (2000–2008), Вадзім Канстанцінавіч Чуйко (2008–2013) - кожны з кіраўнікоў у свой час рабіў усё для аўтарытэту ўстановы. З 2013 года дырэктарам школы становіцца Ігар Мікалаевіч Ліхута.

Працоўны калектыў налічвае 123 чалавек, з іх 81 педагог

з вышэйшай ці першай кваліфікацыйнай катэгорыяй. Многа педагагічных дынастый, а таксама педагогаў – былых вучняў. Са сцен установы выйшла шмат пакаленняў дастойных грамадзян краіны. 11 лістапада 2023 года сябры школы сабраліся адзначыць яе 50-годдзе.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2023 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Дзяржаўнай установе адукацыі «Сярэдняя школа № 6 г. Кобрына» (1973) - 50 гадоў** // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 104-105.

**Дубина, Л**. Сеять разумное, доброе, вечное… / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. – 2023. – 11 лістапада (№ 67). – С. 13 : ил.

11 ноября средняя школа № 6 г. Кобрина отмечает знаменательную дату – 50-летие со дня образования.

**Кондрашук, Н.** Признание на республиканском уровне / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. – 2022. – 20 января (№ 03). – С. 4.

Совместные усилия Кобринского военно-исторического музея им. А. В. Суворова и разработчиков «Познай Кобрин» увенчались признанием на республиканском уровне.

**Лагвіновіч, В.** Пазнай Кобрын / Віктар Лагвіновіч // Настаўніцкая газета. - 2022. — 7 чэрвеня (№ 61). — С. 15 : фат.

Аб праекце «Пазнай Кобрын», які рэалізуецца настаўнікамі і вучнямі СШ № 6 г. Кобрына.

**Ефтифеева, Н. П**. К святыням родного края / Наталья Ефтифеева ; фото из архива СШ № 6 // Кобрин-информ. - 2021. — 23 сентября (№ 38). — С. 2 : фот.

В рамках всебелорусской молодежной экспедиции «Маршрутами памяти. Маршрутами единства» учащиеся СШ № 6 совершили велопоход с целью знакомства с культовыми сооружениями и объектами религиозной культуры Кобринщины.

**Бакун, Е.** Программист — профессия будущего? / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2020. — 30 снежня (№ 100). — С. 6 : фот.

Учащийся СШ № 6 г. Кобрина Ю. Филиппов — лауреат специального фонда Президента Республики Беларусь по поддержке талантливой молодежи.

**Волк, Ю.** Они знают! / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2020. — 16 апреля (№ 16). — С. 3 : фот.

Ученица СШ № 6 Галина Енич и ученик гимназии Александр Ларионец из г. Кобрина вышли в суперфинал проекта Белтелерадиокомпании «Я знаю!»

**Лагвіновіч, В.** Пазнай Кобрын / Віктар Лагвіновіч // Настаўніцкая газета. - 2020. — 5 лістапада (№ 126). — С. 13 : фат.

Энтузіясты з г. Кобрына запусцілі некамерцыйны турыстычны праект «Пазнай Кобрын».

**Савчук, М.** Мой выбор — жить с позитивом! / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2019. — 2 мая (№ 18). — С. 2.

В ГУО «Средняя школа № 6 г. Кобрина» прошла акция «Мой выбор — жить с позитивом!»

**Пальто, К.** Сквозь сердце военные песни прошли / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. - 2017. — 15 сакавіка. — С. 8.

В средней школе № 6 прошел конкурс военно-патриотической песни.

**Тимошук, А.** В мире цифр и алгоритмов / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2017. — 22 лютага. — С. 4.

Имя учителя информатики СШ № 6 г. Кобрина В. Логвиновича широко известно в Беларуси.

**Успех** кобринчанки на престижном научном форуме // Кобрынскі веснік. - 2017. — 29 сакавіка. — С. 3.

В числе финалистов научно-инженерного конкурса учащихся «Белорусская научно-техническая ярмарка» - учащаяся СШ № 6 Е. Бандерук.

**Вашкелевіч, Н.** Навізна ідэй і выніковасць / Надзея Вашкелевіч // Настаўніцкая газета. - 2016. — 26 мая. — С. 3.

Настаўнікі СШ № 6 г. Кобрына В. і Я. Лагвіновічы атрымалі дыплом на XI Рэспубліканскім конкурсе «Камп`ютар. Адукацыя. Інтэрнэт».

**Вовк, Ю.** В научное далёко я начинаю путь / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2016. — 10 марта. — С. 4 : фот.

Учащийся СШ № 6 Владимир Гонгало занимает призовые места на различных республиканских и международных конкурсах.

**Дубина, Л.** В шаге от почетного трофея / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2016. — 4 мая. — С. 1.

Кобринчане Виктор и Яков Логвиновичи - в числе победителей конкурса на лучший интернет-ресурс национального сегмента сети Интернет (сайт «Туристический Кобрин»).

**Дубоўская, В.** Праца з дзецьмі - у радасць / Вольга Дубоўская // Настаўніцкая газета. - 2016. — 7 ліпеня. — С. 8.

В. Лагвіновіч, магістр фізіка-матэматычных навук, працуе настаўнікам матэматыкі ў СШ № 6 г. Кобрына.

**Емельянова, А.** Творчество - часть жизни / Анастасия Емельянова // Кобрынскі веснік. - 2016. — 27 ліпеня. — С. 5.

В СШ № 6 работает объединение по интересам по рукоделию под руководством О. Клейниковой.

**Казакова, А.** Стартап года - 2015 / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2016. — 7 января. — С. 3.

В финале республиканского конкурса стартап- и бизнес-проектов «Стартап года - 2015» выступали кобринчане - учителя математики СШ №: 6 Виктор и Яков Логвиновичи.

**Казакова, А.** Экспресс ООН - 70 / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2016. — 28 января. — С. 4.

Учитель математики СШ № 6 г. Кобрина В. Я. Логвинович является одним из авторов проекта, победившим в числе лучших на конкурсе App4Education американской ИТ-компании.

**«Oscar»** получил **«**Оскара» // Вечерний Брест. - 2016. — 25 мая. — С. 7.

Диплом I степени присужден работе учителей математики кобринской СШ № 6 Виктора и Якова Логвиновичей на республиканском конкурсе «Компьютер. Образование. Интернет».

**Тимошук, А.** Компьютерный талант из Кобрина / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2016. — 30 студзеня. — С. 1, 2.

Юный информатик, ученик 11 класса СШ № 6 Владимир Гонгало принимает участие в различных престижных научных конкурсах республики и стран СНГ.

**Турызм** і інтэрнэт // Народная трыбуна. - 2016. — 6 мая. — С. 3.

Сайт «Турыстычны Кобрын», які распрацавалі настаўнікі Лагвіновічы і вучань Уладзімір Гангала з СШ № 6, атрымаў прызавое месца на Міжнародным форуме «ТІБО-2016».

**Хрустальны** шар // Народная трыбуна. – 2016. – 19 лютага. – С. 3.

Навучэнец СШ № 6 Уладзімір Гангала атрымаў прэстыжную ўзнагароду на Балтыйскім міжнародным навукова-інжынерным конкурсе ў Санкт-Пецярбургу.

**Белов, Д.** Если дело по душе / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2015. — 24 студзеня. — С. 1,2.

Виктор Жукович, преподаватель физики и информатики СШ № 6 - дипломант различных конкурсов, в т.ч. профессионального мастерства, аспирант БГПУ им. М. Танка.

**Казакова, А.** Наши в Варшаве / Анна Казакова, Яков Логвинович // Кобрин-информ. - 2015. — 16 июля. — С. 5.

В Варшавской Международной математической конференции участвовал и выступал с докладом преподаватель СШ № 6, аспирант Виктор Логвинович.

**Казакова, А.** Победителями стали креативные / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2015. — 12 ноября. — С. 2.

Создатели сайта Туристический Кобрин СШ № 6 оказались в числе победителей в туристическом конкурсе «Познай Беларусь».

**Казакова, А.** Покоритель вершин / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2015. — 28 мая. — С. 5.

Об ученике 10 кл. СШ № 6 г. Кобрина В. Гонгало, победителе конкурсов исследовательских работ различного уровня.

**Лесик, И.** Не просто математик / Ирина Лесик ; фото автора и из архива семьи Логвиновича // Кобрынскі веснік. - 2015. — 8 ліпеня. — С. 8.

Я. Я. Логвинович, учитель математики в СШ № 6 - создатель сайта «Туристический Кобрин» и основатель интеллектуального движения на Кобринщине.

**Орлова, И**. Тысячи идей одного года / Ирина Орлова // Заря. - 2015. — 24 декабря. — С. 6.

Проект «Туристический Кобрин» ученика СШ № 6 будет представлять Кобринщину на республиканском этапе конкурса «Сто идей для Беларуси».

**Премия** спецфонда // Кобрин-информ. - 2015. — 16 июля. — С. 3.

Премией спецфонда Президента Республики Беларусь по социальной поддержке одаренной молодежи поощрен В. Гангало, ученик СШ № 6.

**Высокая** оценка знаний // Кобрин-информ. - 2014. — 20 марта. — С. 3 : фото.

Десятиклассник СШ № 6 Роман Лецуе стал победителем третьего этапа олимпиады по физике, организованном Санкт-Петербургским университетом.

**Грэчка, І.** Кобрын рэальны, Кобрын віртуальны / Ігар Грэчка // Настаўніцкая газета. – 2014. - 14 чэрвеня. - С. 18–19.

Настаўнікі матэматыкі СШ № 6 Я. Я. і В. Я. Лагвіновічы стварылі сайт турыстычнай накіраванасці.

**Елизарова, Ж.** Главное в учителе – целостность образа / Жанна Елизарова // Кобрин-информ. – 2014. – 2 октября. – С. 4-5.

Об учителе математики из СШ № 6 Я. Я. Логвиновиче, создателе сайта «Туристический Кобрин».

**Литвинович, Е.** Лучшие сайты создают ... учителя / Евгений Литвинович // Заря. - 2014. — 4 октября. — С. 4

Кобринчанин с солидным педагогическим стажем Я. Логвинович - тому пример.

**Бялоў, Д.** Школа, дзе вучаць беражлівасці / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2013. — 30 сакавіка. — С. 4.

На базе СШ № 6 адбыўся семінар па праграме «Зялёныя школы», якая з'яўляецца адным з накірункаў праекта Еўрасаюза і ПРААН па міжнародным супрацоўніцтве ў галіне аховы навакольнага асяроддзя ў Беларусі.

**Белов, Д**. Чище, эффективнее, рациональнее// Кобрынскі веснік. - 2012. - 21 лістапада. - С. 3.

На базе СШ № 6 учащиеся «Зелёных школ» подготовили выставку поделок из вторсырья и провели мастер-класс по их изготовлению.

**Бялоў, Д**. Першыя крокі ў навуку / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2010. - 31 сакавіка. - С. 2.

Аб навукова-практычнай канферэнцыі ў СШ № 6.

**Курига, Е.** У обновлённой школы новый директор / Елена Курига // Кобрин-информ. - 2008. - 4 сентября. - С. 2.

Вадзім Канстанцінавіч Чуйко – дырэктар СШ № 6.

**Сушко, Э. А.** Обучение чтению: новый подход / Э.А. Сушко // Пачатковая школа. - 2007. - № 2. - С. 9-13.

Диссертационное исследование педагога-психолога СШ № 6 г. Кобрина Э. Сушко.

**Хільчук, М.** Год у Амерыцы / Іарыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 1995. – 1 ліпеня. – С. 2.

Інтэрвью з вучнем СШ № 6 А. Панасюком, які вярнуўся з ЗША, дзе на працягу года вучыўся ў амерыканскай школе.

**Васюк, Н.** Прызнанне – вучыць дзяцей / Наталля Васюк // Кобрынскі веснік. – 1991. – 5 кастрычніка. – С. 2.

Аб настаўніцы СШ № 6 Г. І. Падайка.

Кобрынскі раён
Кобрын
Школы
Навучальныя ўстановы